## Литература

1. Аверинцев, С.С. Жанр как абстракция и жанры как реальность: диалектика замкнутости разомкнутости / С.С. Аверинцев // Взаимосвязь и взаимодействие жанров в развитии античной литературы. – М.: Наука, 1989. – С. 3 – 25.

**У. Г. Кулажанка, Т. І. Міцюхіна (Мінск)**

## СКАРЫНІЯНА Ў ПРАЦАХ ВУЧОНЫХ БДУ

Ужо ў першыя гады існавання БДУ шмат якія навуковыя працы прафесараў і выкладчыкаў, у першую чаргу такіх, як гісторык і этнограф Мітрафан Доўнар-Запольскі (1867 – 1934), пісьменнік Максім Гарэцкі (1893 – 1938), пісьменнік, мовазнавец Язэп Лёсік (1883 – 1940), мовазнавец Язэп Воўк-Леановіч (1891 – 1943), літаратуразнавец Міхаіл Піятуховіч (1891 – 1937) скіроўвалі сваю ўвагу на спадчыну, жыццё і дзейнасць беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, асветніка-гуманіста, вучонага Францыска Скарыны. У іх працах асэнсоўвалася роля асобы Скарыны і яго патрыятычная дзейнасць для асветы народа, навукі і адукацыі. Гэтыя працы фактычна сталі пачаткам фарміравання нацыянальнага навуковага наратыву.

Вучоныя БДУ прынялі самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы зборніка «Чатырохсотлецце беларускага друку», выдадзенага ў 1925 годзе па матэрыялах канферэнцый БДУ і Інбелкульта, прысвечаных юбілею выхаду ў свет віленскіх выданняў Скарыны. Узначаліў рэдкалегію першы рэктар БДУ прафесар Уладзімір Пічэта (1878 – 1947), а ў склад рэдкалегіі ўвайшлі гісторык Васіль Дружчыц (1886 – 1937), Мікола Шчакаціхін (1896 – 1940), узгаданы вышэй Язэп Лёсік. З 13-ці артыкулаў, уключаных у зборнік, 11 належала вучоным БДУ. Тэматыка артыкулаў раскрывае шматграннасць даследаванняў, прысвечаных Скарыне. Напрыклад, прафесар Уладзімір Перцаў (1977 – 1960) апублікаваў артыкул «Гуманізм у Італіі», гісторык Антон Ясінскі (1864 – 1933) – артыкул пра культурнае развіццё ў Чэхіі ў пачатку XVI ст., Міхаіл Піятуховіч апублікаваў вынікі сваіх даследаванняў па літаратурнай дзейнасці Ф. Скарыны, Язэп Воўк-Левановіч праанатізаваў мову скарынаўскай Біблії.

Рэктару БДУ Уладзіміру Пічэту ў названым зборніку належаць тры артыкулы, у тым ліку яго вядомы гістарыяграфічны агляд «Scoriniana» (1776–1926), які на працягу даволі значнага часу з'яўляўся найбольш поўнай і змястоўнай падобнай працай. Вывучэнню скарыніяны прысвечаны і іншыя работы Пічэты: раздзелы з манаграфій і падручнікаў, артыкулы, рэцэнзіі. Вядома, што менавіта У. Пічэта першым заклікаў разглядаць асобу Скарыны ў шырокім грамадска-палітычным кантэксце.

Трэба зазначыць, што ва ўмовах савецкай рэчаіснасці некаторыя з аўтараў не пазбегнулі савецкіх ідэалагічных схемаў, у тых умовах не змаглі аб'ектыўна ацаніць Скарыну як хрысціянскага філосафа і асветніка, знаўцу Бібліі і інш.

Тым не менш большасць іх высноў не страціла сваёй актуальнасці да сённяшняга часу. Пра актуальнасць работ вядомых вучоных БДУ сведчыць той факт, што лепшыя з іх увайшлі ў юбілейнае выданне да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка», якое склалі артыкулы і нарысы (уклад. А. Сушы, 2017). Гэта працы прафесараў М. Доўнар-Запольскага, У. Перцава, У. Ігнатоўскага; філолагаў – Я. Воўк-Левановіча, М. Гарэцкага, М. Піятуховіча, М. Шчакаціхіна.

Важна адзначыць, што яшчэ ў першыя гады дзейнасці БДУ раздзелы, прысвечаныя Скарыну былі ўключаны ў вучэбныя курсы. Можна ўзгадаць «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» Мікалая Янчука (1922) і 4-е выданне «Гісторыі беларускае літаратуры» (1926) Максіма Гарэцкага ды інш.

Традыцыі першых вучоных універсітэта былі працягнуты і ў другой палове XX в. Так у 1953 г. гісторыкам Валянцінай Чапко пад кіраўніцтвам акадэміка У. Перцава была абаронена дысертацыя, прысвечаная грамадскім і культурным поглядам Ф. Скарыны.

Мовазнаўца Леў Шакун у сваёй доктарскай дысертацыі «Развіццё беларускай літаратурнай мовы» (Мінск, 1964) асобны раздзел прысвяціў вывучэнню асаблівасцей мовы Францыска Скарыны.

Розным аспектам жыцця і дзейнасці беларускага асветніка і першадрукара прысвяцілі свае працы выкладчыкі БДУ новага

пакалення – гісторыкі Павел Лойка, Аляксандр Ігнаценка, Надзея Гусакова; філолагі: Сцяпан Александровіч, Алег Лойка, Міхась Ларчанка, Міхась Булахаў, Святлана Ганчарова-Грабоўская, Таццяна Казакова; філосафы: Аляксандар Данілаў, Вячаслаў Шалькевіч, Генадзь Грушавы; юрысты Язэп Юхо, Таісія Доўнар, Людміла Голубева і многія іншыя.

Паколькі адна з задач бібліятэкі ўніверсітэта – папулярызацыя і прэзентацыя прац вучоных у сусветнай інфармацыйнай прасторы, напярэдадні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання Фундаментальная бібліятэка БДУ ініцыявала праект «Скарыніяна ў працах вучоных БДУ».

Мэта праекта

Паказаць унёсак вучоных і выкладчыкаў БДУ ў даследаванне «Скарыніяны»; папулярызацыя асобы Скарыны ў акадэмічным асяроддзі ўніверсітэта. Прадставіць магчымасць аператыўнага адкрытага доступу да лічбавых варыянтаў найбольш значных прац.

Ініцыятыву падтрымала кіраўніцтва ўніверсітэта і кіраўнікі гуманітарных факультэтаў БДУ – філалагічнага, гістарычнага, юрыдычнага, філасофіі і сацыяльных навук.

Рэалізацыя праекта

Праект быў рэалізаваны ў некалькі этапаў:

1. Выяўленне публікацый вучоных БДУ (1921 – 2017), прысвечаных Ф. Скарыну.
2. Складанне бібліяграфічных спісаў навуковых прац.
3. Стварэнне калекцыі «Скарыніяна ў працах супрацоўнікаў БДУ» у Электроннай бібліятэцы БДУ.

У працэсе фарміравання спісу даследчыкаў выкарыстоўваліся друкаваныя і электронныя крыніцы аб навуковай і навучальнай дзейнасці супрацоўнікаў. Гэта выданні па гісторыі БДУ і яго факультэтаў, выданні, прысвечаныя навуковай і педагагічнай дзейнасці найбольш знакамітых вучоных, бібліяграфічныя паказальнікі, энцыклапедыі, даведнікі. Вывучалася інфармацыя, размешчаная на старонках сайтаў факультэтаў, персанальных старонак вучоных на галоўным сайце БДУ.

Для рэтраспектыўнага пошуку звестак пра аўтараў былі вывучаны бібліяграфічныя паказальнікі, энцыклапедыі.

Напрыклад, паказальнікі літаратуры: «Францыск Скарына. Жыццё і дзейнасць» (1990, 1995), падрыхтаваныя НАН Беларусі, энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час», Летапіс друку Беларусі, каталогі і картатэкі ФБ БДУ і іншых бібліятэк Беларусі, зборнікі матэрыялаў канферэнцый прысвечаных Ф. Скарыну, у тым ліку «Скарынаўскіх чытанняў». Пры адборы прац выкарыстоўваліся электронныя каталогі ФБ БДУ, Электроннай бібліятэкі, рэсурсаў Кніжнай палаты і інш.

У выніку быў складзены бібліяграфічны спіс, які ўключае больш за 300 бібліяграфічных запісаў 75-ці аўтараў-вучоных БДУ: гісторыкаў, філолагаў, філосафаў, юрыстаў і журналістаў.

На аснове пераліку была сфармавана лічбавая калекцыя «Скарыніяна ў працах супрацоўнікаў БДУ» ў Электроннай бібліятэцы БДУ, у якую былі ўключаны 177 дакументаў.

Калекцыя складаецца з 4-х раздзелаў:

1. Дзейнасць Ф. Скарыны ў працах гісторыкаў – 27 дакументаў;
2. Дзейнасць Ф. Скарыны ў працах філолагаў – 114 дакументаў;
3. Дзейнасць Ф. Скарыны ў працах філосафаў – 7 дакументаў;
4. Дзейнасць Ф. Скарыны ў працах юрыстаў – 34 дакументы.

Такім чынам, выкарыстанне новых тэхналогій дазволіла:

1. Аб'яднаць розныя бібліяграфічныя адзінкі, прысвечаныя вывучэнню спадчыны Скарыны ў БДУ ў адной калекцыі.
2. Даць магчымасць доступу да названых прац пры выкарыстанні ў вучэбнай і навуковай рабоце студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў.
3. Забяспечыць магчымасць аператыўнага пошуку: па прозвішчу аўтара, раздзелу навукі, храналогіі, тэматыцы і інш.

На наш погляд, важным момантам з'яўляецца наяўнасць поўнага адкрытага доступу да калекцыі і эфектыўная індэксацыя поўных тэкстаў пошукавымі машынамі ў Інтэрнэт і ў першую чаргу «Google».

У сувязі з юбілейнай датай у краіне актывізаваліся даследаванні па вывучэнні жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны. Напрыклад, шмат работ па асэнсаванні хрысціянскага светапогляду першадрукара было зроблена выкладчыкамі Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ, у прыватнасці протаіерэем Сергіем Гардуном. Такім чынам,

рэалізацыя праекта будзе мець працяг – новыя працы будуць размяшчацца ў адпаведных раздзелах.

Стварэнне поўнатэкставай калекцыі і арганізацыя доступу да яе, гэта не толькі праца па выяўленні і захаванні дакументаў, праект «Скарыніяна ў працах вучоных БДУ» стане падставай для больш актыўнага ўключэння навуковых работ па гэтай тэме ў вучэбную дзейнасць універсітэта, будзе стымуляваць новыя даследаванні.

**А. І. Бельскі (Мінск)**

## АСОБА ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ Ў ПАЭТЫЧНЫМ УСПРЫМАННІ АЛЕГА ЛОЙКІ

Асоба Францыска Скарыны – ідэяўтваральны цэнтр у канцэптасферы Алега Лойкі. Зварот да маштабнай постаці беларускага асветніка і гуманіста ў яго творчасці быў цалкам заканамерным. Пасля мастацкага ўвасаблення жыцця і дзейнасці Янкі Купалы ў рамане-эсэ «Як агонь, як вада…» (1984) і выхаду на асэнсаванне нацыятворнага руху пачатку XX ст. А. Лойка скіраваўся да эпохі беларускага Адраджэння XVI ст. з яе ключавой, крэатыўнай фігурай Ф. Скарыны. Вынікам даследча-творчай працы і стаў раман-эсэ «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990), да якога прымыкае аповесць «Скарына на Градчанах» (1990).

Калі паглядзець на плён дзейнасці А. Лойкі ў дыскурсе Скарыніяны, то можна адразу канстатаваць: у другой палове 1980-х – 1990-я гг. адбывалася надзвычай актыўнае навукова-канцэптуальнае спазнанне феномену беларускага першадрукара, асветніка, патрыёта, дзеяча эпохі Адраджэння, прэзентацыя ягонай асобы на значных іміджавых падзеях. У пэўнай ступені падагульняльным па скарынінскай тэматыцы з'яўляецца дастаткова аб'ёмны раздзел «Францыск Скарына» ў падручніку «Старабеларуская літаратура» (2001). А. Лойка – даследчык-скарыназнавец, які выступаў на высокім міжнародным узроўні, імкнучыся пашырыць уяўленне пра асобу Ф. Скарыны як знакавую постаць агульнаеўрапейскага і сусветнага маштабу. «Скарына і Кракаў» – тэма, з якой ён выступіў у сценах Ягелонскага ўніверсітэта (1989), «Скарына ў Падуі» – назва яго